І.Г. Гушчынскі

# СТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ СІСТЭМЫ ГРАМАДСКАЙ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ (1917–1920 гг.)

Сучасная сістэма дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь павінна забяспечваць рознабаковае развіццё дзіця ў адпаведнасці з яго індывідуальнымі асаблівасцямі, патрабаваннямі дзяржавы і грамадства. Паспяховае дасягненне дадзенай мэты прадугледжвае ўлік як міравога, так і айчыннага вопыту ў дадзенай сферы. Не выключэннем з'яўляецца і сістэма грамадскага дашкольнага выхавання, якая пачала фарміравацца савецкай уладай пасля кастрычніцкага палітычнага перавароту 1917 г., з усёй супярэчлівасцю яе мэт, зместу і метадаў.

Метадалагічным падмуркам савецкай адукацыйнай сістэмы стала марксісцка-ленінская філасофія. К. Маркс і Ф. Энгельс сцвярджалі, што выхаванне ў кожную эпоху абумоўлена грамадскімі адносінамі, у класавым грамадстве яно прымае класавы характар. Гэтая ідэя знайшла адлюстраванне і ў працах В.І. Леніна. Бальшавікі з самага пачатку пачалі адкрыта выкарыстоўваць сістэму выхавання і адукацыі дзяцей і моладзі як інструмент умацавання сваёй улады і рэалізацыі сваіх планаў [4, с. 242].

Да кастрычніка 1917 г. дашкольныя ўстановы ў Расіі былі хутчэй якімсьці педагагічным эксперыментам, чым распаўсюджаным з'явай. Цяпер жа грамадскае дашкольнае выхаванне стала агульнадзяржаўнай задачай [3, с. 29]. Дэкрэтам Саўнаркама ад 9 лістапада 1917 г. дашкольнае выхаванне было ўпершыню ўключана ў адзіную сістэму народнай адукацыі. У дэкларацыі аб дашкольным выхаванні ад 20 снежня 1917 г. адзначалася, што сістэма дашкольнага выхавання павінна "з'яўляцца складовай часткай усёй школьнай сістэмы і павінна быць арганічна звязана ў адзінае цэлае са ўсёй сістэмай народнай адукацыі" [5, с. 253]. Пры Народным камісарыяце асветы (НКА) быў створаны дашкольны аддзел, які ўзначаліла Д.А. Лазуркіна.

Пешы год працы дашкольнага аддзела НКА быў прысвечаны вырашэнню арганізацыйных пытанняў. У 1918 г. быў распрацаваны план "арганізацыі справы дашкольнага выхавання", якое разглядалася як адна з найважнейшых задач часу. Гэта тлумачылася "агульным фізічным і духоўным зводам дзяцей працоўных класаў" як следства сацыяльна-эканамічных прычын, а таксама іх голадам ў выніку беспрацоўя і харчовага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

крызісу. Задача дашкольных устаноў была вызначана наступным чынам: “Не толькі шляхам догляду даць дзецям з самага ранняга ўзросту здавальняючыя ўмовы існавання, але разам з тым даць гэтым дзецям грамадскае выхаванне”. Прапаноўваліся наступныя тыпы дашкольных устаноў: яслі – для дзяцей ранняга ўзросту; дзіцячыя сады – для дзяцей ад 3 да 7 гадоў, дзе яны праводзілі б ўвесь працоўны час маці і атрымлівалі ежу; пляцоўкі, дзе летам пад кіраўніцтвам дарослага маглі збірацца дзеці рознага ўзросту; калоніі – вываз дзяцей ў пэўную мясцовасць з мэтай падняцця іх фізічнага і псіхічнага ўзроўню ва ўмовах прыроды і свабоднай працы [1, с. 260].

VIII з’ездзе РКП (б), які адбыўся ў сакавіку 1919 г., паставіў перад дашкольнымі ўстановамі канкрэтныя задачы: у першую чаргу палепшыць грамадскае выхаванне праз стварэнне сеткі бясплатных дзіцячых садоў, ясляў, ачагоў і разняволенне жанчыны. Шляхі рэалізацыі гэтых задач разглядаліся на Першым Усерасійскім з’ездзе па дашкольным выхаванні (красавік 1919 г.). У яго рэзалюцыях асноўным тыпам дашкольнай установы быў вызначаны дзіцячы сад – для дзяцей 3 -7 гадоў з шасцігадзінным знаходжаннем (але пры неабходнасці – больш працяглым). Колькасць дзяцей на аднаго дарослага кіраўніка ў іх не павінна была перавышаць 15 (у асобных выпадках 20) чалавек. Акрамя таго, з’езд акрэсліў патрабаванні да арганізацыі розных аспектаў дзейнасці дашкольных устаноў: выкарыстанне роднай мовы, сувязь з сям’ёй, пастаноўка медыцынскай працы і г. д. [1, с. 262].

У цэлым, у першыя паслярэвалюцыйныя гады новай уладай была праведзена значная праца па стварэнні дашкольных устаноў. Так, ужо ў 1920 г. у іх выхоўвалася больш 250 тыс. дзяцей. Гэта былі невялікія бясплатныя дзіцячыя сады (на 20–50 чалавек), створаныя на дзяржаўныя сродкі. Акрамя таго, функцыянавалі дзіцячыя пляцоўкі, дзіцячыя калоніі, дзіцячыя дамы, школы–дзіцячыя сады, а таксама спецыяльныя дзіцячыя сады для глухіх і глуханямых дзяцей [1, с. 263].

Паралельна з адзначанымі працэсамі ў першыя паслярэвалюцыйныя гады мелі месца вострыя дыскусіі адносна ўвогуле сутнасці грамадскага дашкольнага выхавання: з аднаго боку – тэндэнцыя, для якой было ўласціва прызнанне традыцыйных каштоўнасцей (значная роля сям’і і маці ў выхаванні і г. д.), з іншага – рэзка негатыўная ацэнка інстытута сям’і ў яго тагачасным выглядзе. Так, вядомы савецкі педагог і псіхолаг К.М. Карнілаў пісаў наступнае: “Час, нарэшце, пакінуць гэты погляд, што выхоўваць маленькага дзіця – гэта значыць яго любіць, песціць, карміць. Адгэтуль

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

павінна памерці гэта трагедыя інтэлігентнай маці... Няхай яна без вагання аддаецца сваёй прафесійнай працы, аддаўшы выхаванне дзіця спецыяльнай грамадскай установе ў асобе дзіцячага сада, дома дзіця і г. д.” [2, с. 13]. Яшчэ больш далёка ў сваім рэвалюцыйным радыкалізме, у тым ліку ў кантэксце выхавання дзяцей, ішла А.М. Калантай, якая актыўна ўкараняла ў грамадскую свядомасць ідэі, што дзяржава цалкам возьме на сябе ўсю адказнасць за выхаванне і адукацыю дзіця [3, с. 29]. Канец падобным дыскусіям паклала пастанова ЦК ВКП (б) 1930 г. “О работе по перестройке быта”, у якой адзначалася: “... разам з ростам руху за сацыялістычны быт маюць месца крайне неабгрунтаваныя паўфантастычныя, а значыць надзвычай шкодныя спробы асобных таварышаў “адным скокам” пераскочыць праз ... перашкоды на шляху да сацыялістычнай перабудовы быту. ... Да такіх спроб некаторых работнікаў, якія скрываюць пад “левай фразай” сваю апартуністычную сутнасць, адносяцца ... праекты ... выхавання дзяцей з аддзяленнем іх ад бацькоў, са скасаваннем бытавых сувязей членаў сям’і і г.д.” [3, с. 31].

Такім чынам мы бачым, працэс станаўлення савецкай сістэмы грамадскага дашкольнага выхавання быў складаным і супярэчлівым. Надзвычай важнае і пазітыўнае значэнне мела стварэнне шырокай сеткі бясплатных дашкольных устаноў, якія з’яўляліся складовай часткай усёй адукацыйнай сістэмы. У той жа час новая ўлада выкарыстоўвала іх з мэтай падпарадкавання асобы інтарэсам дзяржавы, ставячы на першы план ў развіцці дзяцей палітыка-ідэалагічны фактар.

**Літаратура і крыніцы:**


1. Егоров, С.Ф. Введение в историю дошкольной педагогики : Учеб. пособие для пед. / С.Ф.Егоров, С.В.Лыков, Л.М.Волобуева ; Под ред. С.Ф.Егорова. - М. : Academia, 2001. - 317, [2] с.
2. Корнилов, К.М. Дошкольное воспитание пролетарских детей / К.М. Корнилов. – М. : Практические знания, 1919. – 15 с.
3. Литвин, Л.Н. Общественное дошкольное воспитание в РСФСР, 1917 -1940 гг. / Л.Н. Литвин. – Мурманск : Мурманский гос. пед. ин-т, 1992. – 166 с.
4. Торосян, В.Г. История образования и педагогической мысли / В.Г. Торосян. – М. : Владос-Пресс, 2006. – 350, [1] с.
5. Шабаева, М.Ф. История дошкольной педагогики / М.Ф. Шабаева [и др.] ; под ред. Л.Н. Литвина. - М. : Просвещение, 1989. -351, [1] с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ